Ролю падмурка, тэарэтычнай базы, асновы набыцця камунікатыўнай кампетэнтнасці павінны, на наш погляд, выконваць курсы псіхолага-педагагічнага цыкла. Але іх трэба выкладаць з улікам патрабаванняў будучай спецыяльнасці, звяртаючы ўвагу студэнтаў на магчымасці выкарыстання атрыманых ведаў у іх прафесійных зносінах. Не менш важнымі з'яўляюцца і агульнаадукацыйныя дысцыпліны: гісторыя, філасофія, літаратура і інш. Яны ствараюць інфармацыйную базу, запас ведаў, дастатковых дзеля таго, каб свабодна арыентавацца ў разнастайных пытаннях мінулага і сучаснасці, літаратуры і мастацтва, якія штодзённа і непазбежна ўзнікаюць у працэсе бібліятэчнага абслугоўвання. Нарэшце, шэраг спецкурсаў, такіх як «Бібліяграфічныя зносіны», «Камунікатыўныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці», «Псіхалогія кіравання», «Культура мовы», павінны мэтанакіравана і грунтоўна фарміраваць камунікатыўныя навыкі і ўменні, рыхтаваць будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў да прадуктыўных зносін з карыстальнікамі бібліятэк і калегамі па рабоце. Далей камунікатыўная культура, здольнасці да актыўных зносін праяўляюцца, шліфуюцца і ўдасканальваюцца ў ходзе вывучэння студэнтамі спецыяльных дысцыплін, дзе адпрацоўваюцца алгарытмы паводзін у канкрэтных, найбольш тыповых і распаўсюджаных вытворчых сітуацыях.

Такім чынам, амаль усе вучэбныя дысцыпліны ў той ці іншай ступені спрыяюць фарміраванню камунікатыўных якасцей студэнтаў. Трэба толькі звяртаць увагу і на засваенне імі ведаў, і на здольнасць гэтыя веды праяўляць, паказваць, перадаваць з дапамогай камунікатыўных сродкаў. Аднак галоўным звяном у сістэме камунікатыўнага выхавання студэнтаў павінны стаць спецкурсы і спецсемінары па праблемах прафесійных зносін як найбольш мэтакіраваныя і выніковыя.

**Савельева Т.М.,**
*прафесар*

## АБ НЕАБХОДНАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАГА МЫСЛЕННЯ Ў СТУДЭНТАЎ ВНУ

Будучае нашай рэспублікі залежыць ад аместу бесперапыннай адукацыі. Вось чаму адукацыю трэба разглядаць як сродак, умову і фактар сацыяльнай рэпрадукцыі чалавека. Адукацыя павінна забяспечыць станаўленне «механізма» развіцця асобы чалавека, што з'яўляецца адным з рашаючых фактараў развіцця грамадства.

Павысіць якасць адукацыі, забяспечыць больш высокі ўзровень выкладання прадметаў у сістэме бесперапыннай адукацыі магчыма толькі на аснове выкарыстання тых ведаў, якія назапасіла за апошнія дзесяцігоддзі псіхалагічная навука.

З улікам адзначанага важнейшай задачай сучаснай вышэйшай адукацыі павінна быць фарміраванне ў студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі прафесійнага мыслення і асобасных якасцей чалавека.

Заўважым, што мысленне як грамадска-гістарычная з'ява заўсёды ўзнікае на аснове працы і сацыяльнай практыкі чалавека.

Развіццё ж самой практыкі прыводзіць да змен у мысленні спецыяліста, а развіццё працы і ўзнікненне розных відаў прафесійнай дзейнасці, у сваю чаргу, — да прафесіяналізацыі чалавека.

У спецыяльнай і філасофскай літаратуры даецца апісанне розных тыпаў мыслення: першабытнага, антычнага, сярэдневяковага, рабаўладальніка і раба, феадала і прыгоннага селяніна, буржуа і пралетарыя, філасофскага, прыродазнаўчага, мастацкага, маральнага, рэлігійнага, юрыдычнага, палітычнага, навуковага і інш.

Павышэнне эфектыўнасці вышэйшай адукацыі ў сучаснай ВНУ немагчыма без павышэння ўзроўню прафесійнага мыслення.

У культурна-гістарычным плане прафесійны тып мыслення ўзнікае як вынік спецыялізаванага мыслення пэўных сацыяль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных груп у ходзе гістарычнага станаўлення той ці іншай прафесіі. Сучасныя прафесіі, як ніколі раней, прад'яўляюць высокія патрабаванні да кваліфікацыі работнікаў розных галін гаспадарання. Таму прафесійная падрыхтоўка спецыялістаў павінна абапірацца на значны аб'ём сістэматызаваных навуковых ведаў, на адпаведны ўзровень мыслення. Не патрабуе доказаў тое, што ў розных галінах спецыялізацыі аб'ём ведаў вельмі хутка ўзрастае, а тэрміны навучання студэнтаў абмежаваны некалькімі гадамі. Са сказанага вынікае, што пры падрыхтоўцы спецыялістаў у ВНУ трэба больш мэтанакіравана фарміраваць такія якасці, якія неабходны кожнаму спецыялісту: мастаку, артысту, бібліятэкару і наогул работніку ўсіх галін ведаў.

Вельмі важна фарміраваць у студэнтаў ВНУ менавіта той тып мыслення, які дазволіць ім аднаўляць прафесійныя веды, павышаць кваліфікацыю, крытычна мысліць, знаходзіць новыя арыгінальныя спосабы вырашэння прафесійных задач, хутка арыентавацца у бурнай плыні прафесійнай інфармацыі.

Трэба мець на ўвазе, што тэрмін «прафесійнае мысленне» стаў шырока прымяняцца з другой паловы XX стагоддзя ў сувязі з інтэлектуалізацыяй грамадскай працы. І не выпадкова таму спецыялісты самага рознага профілю пачынаюць аналізаваць спецыфіку інтэлектуальнай дзейнасці ў розных сферах працы. У сучасны перыяд развіцця нашага грамадства адбываецца далейшая дыферэнцыяцыя прафесійных тыпаў мыслення ў адпаведнасці з характарам дзейнасці чалавека. Так, С.Эйзенштэйн і Ю.Слонімскі ў мастацкім тыпе мыслення вылучаюць натуралістычны, рамантычны, сентыментальны і іншыя стылі.

Акрамя таго, у адпаведнасці з жанрамі ўнутры мастацкага мыслення вылучаецца мысленне музычнае, паэтычнае, сцэнічнае, кампазіцыйнае, «мантажнае» (кінарэжысёра), балетнае (балетмайстра і артыста балета) і інш.

Калі мы гаворым аб прафесійным мысленні, то ў першую чаргу маем на ўвазе некаторыя асаблівасці спецыяліста, якія дазваляюць яму паспяхова выконваць прафесійныя задачы, г.зн. вырашаць іх хутка, правільна і арыгінальна. Менавіта такі спецыяліст характарызуецца як чалавек творчы, здольны да рацыяналізатарства і адкрыцця новага.

У псіхалагічнай навуцы склаліся два падыходы да вызначэння сутнасці прафесійнага мыслення. Так, у адных даследаваннях прафесійнае мысленне ўяўляецца як *працэс* (курсіў наш. — Т.С.) вырашэння прафесійных задач у той ці іншай галіне ведаў, у другіх — як той ці іншы тып *арыенціроўкі* (курсіў наш.— Т.С.) спецыяліста ў прадмеце сваёй дзейнасці. Першы падыход звязаны з псіхалагічнай канцэпцыяй С.Л.Рубінштэйна аб дэтэрмінацыі мыслення «знешнімі ўмовамі праз унутраныя». У ролі знешніх умоў, паводле С.Л.Рубінштэйна, выступае задача, якая абумоўлівае аб'ектыўны змест і напрамак разумовага працэсу. Таму невыпадкова ў працэсе даследаванняў па праблеме прафесійнага мыслення асноўная увага ўдзяляецца аналізу спецыфічных асаблівасцей прафесійных задач.

Другі падыход грунтуецца на канцэпцыі П.Я.Гальперына аб паэтапным фарміраванні разумовых дзеянняў і паняццяў, паводле якой спецыфічныя асаблівасці мыслення, змест і структура разумовага вобраза не могуць быць абумоўлены характарам, асаблівасцямі і зместам задач. Мысленне ў дадзеным выпадку разглядаецца як той ці іншы тып «арыенціроўкі суб'екта ў прадмеце дзейнасці і яе ўмовах, што, у сваю чаргу, вызначае характар вырашаемых задач». Трэба зыходзіць з таго, што адзін і той жа прадмет можа быць па-рознаму адлюстраваны ў разумовым вобразе. Гэта залежыць ад спосабу і ўмоў яго фарміравання. Так, напрыклад, вобраз можа адлюстроўваць: неістотныя якасці прадмета як адзінкавага ўтварэння; заканамерна ўзаемазвязаныя якасці як асаблівага; усеагульнае, сутнасць, закон арганізацыі аб'екта. Паколькі адлюстраванне аднаго і таго ж прадмета дзейнасці можа быць розным, то і арыенціроўка на яго аснове пры вырашэнні задачы таксама будзе адбывацца па-рознаму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канцэпцыя П.Я.Гальперына дазваляе разглядаць характарыстыкі прафесійнага мыслення як выражэнне пэўнага тыпу арыенціроўкі. З гэтых жа пазіцый тлумачацца псіхолагам З.Я.Рэшэтавай псіхалагічныя адрозненні ў мысленні шырокапрофільнага і шматпрофільнага спецыялістаў, якія вырашаюць прафесійныя задачы па аснове рознага тыпу арыенціровачнай асновы дзейнасці. Даследчык адзначае, што ў мысленні шырокапрофільнага спецыяліста прадмет яго дзейнасці адлюстроўваецца ва ўсеагульнай аснове і шматлікасці формаў выражэння ў розных задачах. Што ж датычыць шматпрофільнага спецыяліста, то ў яго не сфарміравана абагульняючая арыенціровачная аснова дзеянняў. Акрамя таго, у яго мысленні агульныя асновы прадмета не адлюстроўваюцца, а варыянты разглядаюцца як розныя, не звязаныя паміж сабой.

Мы ўжо зазначылі, што працэс мыслення адбываецца ў чалавека як вырашэнне тых ці іншых задач. Але ж раскрыццё спецыфікі прафесійных задач не зусім простая справа. Аб гэтым сведчаць навуковыя даследаванні, праведзеныя спецыялістамі рознага профілю.

Асаблівасці прафесійнага практычнага мыслення ўпершыню ў былым Савецкім Саюзе дэталёва даследаваны і апісаны вядомым псіхолагам Б.М.Цяпловым. Менавіта ён падкрэслівае адну з галоўных асаблівасцей практычнага мыслення — уключанасць у практычную дзейнасць. Заўважым, што тэарэтычнае і практычнае мысленне не два «розныя інтэлекты». Інтэлект у чалавека адзін і адзіныя асноўныя механізмы мыслення, але розныя формы разумовай дзейнасці, паколькі ставяцца розныя задачы. У сваім даследаванні Б.М.Цяплоў адзначае, што ўмовы, даныя, з якіх часцей за ўсё зыходзіць палкаводзец, з'яўляюцца складанымі, шматграннымі, заблытанымі і не заўсёды цалкам вядомымі. Акрамя таго, яны могуць мяняцца. Становішча на вайне вельмі хутка мяняецца і ніколі не бывае поўнасцю вядомым.

Другой асаблівасцю практычнага мыслення з'яўляецца непарыўная сувязь мыслення і волі. Б.М.Цяплоў вылзяляе таксама і такую важную якасць прафесійнага мыслення, як гібкасць. Гібкасць мыслення праяўляецца ў змяненні ці замене плана пры выяўленні яго неадпаведнасці дадзеным умовам. Цвёрдасць волі, упартасць спецыяліста-прафесіянала заўсёды выяўляюцца ў адстойванні і рэалізацыі плана, калі гэты план лепшы за ўсе папярэднія.

Праблема агульнага і адзінкавага таксама з'яўляецца важнай у мысленні спецыяліста-прафесіянала. Перад такім мысленнем ставіцца задача прымянення ведаў усеагульнага да прыватных выпадкаў. Вырашаючы прыватныя канкрэтныя задачы, мысленне прадугледжвае і веданне агульнага, але абагульненні маюць спецыфічны характар. Яны забяспечваюць прымяненне ведаў на практыцы. Пры гэтым прыватнае, адзінкавае не толькі больш багатае, але і больш рухомае, яно праяўляецца па-рознаму ў залежнасці ад зместу, спосабаў і сродкаў уздзеяння на яго.

Высокі ўзровень прафесіяналізму многія даследчыкі звязваюць са здольнасцю бачыць тое, што іншыя не бачаць. Менавіта такая здольнасць выяўляе індывідуальнасць прафесіянала.

Адна з найважнейшых характарыстык прафесійнага мыслення — уменне вылучаць істотнае ў працэсе аналізу складанага матэрыялу іператвараць гэта складанае ў простае, паколькі толькі простае рашэнне прыводзіць да поспеху. Такое ўменне — уменне схопліваць адначасова і цэлае, і яго часткі (дэталі) — неабходная ўмова выдзялення істотнага.

Асаблівасцю прафесійнага мыслення з'яўляецца інтуіцыя, якая разглядаецца як здольнасць хутка арыентавацца ў складанай сітуацыі, знаходзіць правільнае рашэнне. Гэтая здольнасць — вынік складанай, доўгатэрміновай падрыхтоўчай работы.

Асаблівасці прафесійнага мыслення праяўляюцца і ў арыенціроўцы спецыяліста ў прадмеце сваей дзейнасці, а таксама ў выкарыстанні сродкаў, спосабаў уздзеяння на гэты прадмет (тут маецца на ўвазе тэхналагічны бок прафесійнай дзейнасці).

Даследчыкі падкрэсліваюць сувязь прадметнага зместу і тэхналогіі прафесійнага дзе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яння з формамі і логікай прафесійнага мыслення. Спецыфічны прадмет «задае» спосаб яго асэнсавання, і мысленне прафесіянала «адпавядае» форме і логіцы дадзенага аб'екта, падпарадкоўваецца яму. У гэтым выпадку аб'ектыўная логіка прадмета дзейнасці становіцца суб'ектыўнай логікай мыслення спецыяліста. Вялікае значэнне для прафесійнага мыслення мае «пачуццё» матэрыялу, партнёра, ворага, кампазіцыі, малюнка дзеяння і інш. Яно з'яўляецца асновай выбару адэкватных сродкаў і спосабаў вырашэння прафесійных задач. Практыка паказвае, што прафесіяналы высокага класа "адчуваюць" прадметы і прылады, сродкі дзейнасці як саміх сябе, свае органы — як працяг свайго цела.

Актуальным у сучасны перыяд з'яўляецца раскрыццё структуры прафесійнай дзейнасці і яе сувязі са спецыфікай мыслення. Перспектыўным, на нашу думку, з'яўляецца такое вырашэнне дадзенай праблемы, якое абапіраецца на тэорыю дзейнасці, распрацаваную ў псіхалогіі А.М.Лявонцьевым. (У дадзенай тэорыі сцвярджаецца думка аб прадметнай дзейнасці. Прадмет пры гэтым разумеецца як такі аб'ект, на які накіравана знешняя ці ўнутраная дзейнасць.)

Дзейнасць чалавека дэтэрмінавана знешнім светам. Такая дэтэрмінаванасць тлумачыцца тым, што некаторая патрэбнасць успрымаецца як неабходнасць, патрэба ў чым-небудзь, выклікае пошукавую актыўнасць суб'екта. У працэсе такой актыўнасці, як вядома, адбываецца прыпадабненне дзейнасці якасцям аб'ектаў. Менавіта ў гэтым праяўляецца высокая пластычнасць дзейнасці. Акрамя таго, у ходзе прыпадабнення патрэбнасць знаходзіць свой прадмет, апрадмечваецца і ператвараецца ў канкрэтны матыў дзейнасці. затым сам аб'ект, які накіроўвае дзейнасць, замяняецца яго вобразам, што ўзнікае пры пошукава-апрабавальных дзеяннях суб'екта са знешнім аб'ектам.

Прадстаўнікамі навуковай школы Лявонцьева А.М. дастаткова падрабязна раскрыта псіхалагічная будова дзейнасці. Асноўнымі структурнымі кампанентамі цэласнай дзейнасці, як вядома, выступаюць патрэбнасці, матывы, мэты, умовы дасягнення мэты і суадносныя з імі дзейнасць, дзеянні і аперацыі. Пры гэтым дзейнасць суадносіцца з патрэбнасцю і матывам ці з працэсам вызначэння іх прадметнага зместу, дзеянне — з мэтай, аперацыі — з умовамі. Матыў заўсёды падахвочвае суб'екта да пастаноўкі мэты, дзеля дасягнення якой неабходна выкананне дзеяння. Спосаб ажыццяўлення дзеяння, які залежыць ад умоў, з'яўляецца аперацыяй.

У названай тэорыі істотная ўвага ўдзяляецца рухомасці і зменлівасці кампанентаў дзейнасці. Так, напрыклад, дзейнасць можа ператварацца ў дзеянне, калі страціць свой матыў, ці, наадварот, дзеянне ператвараецца ў дзейнасць у працэсе «зруху», пераходу матыву на мэту; пры змяненні мэты дзеяння апошняе ператвараецца ў аперацыю. Усе кампаненты дзейнасці могуць быць больш дробнымі. Так, пры дзяленні некаторай мэты на падмэты дзеянне драбніцца на шэраг паслядоўных дзеянняў.

Дадзеная характарыстыка будовы дзейнасці і ўзаемапераўтварэння яе састаўляючых уяўляе вялікую цікавасць і можа служыць асновай для аналізу прафесійнай дзейнасці, калі неабходна зыходзіць перш-наперш з яе структуры. З нашага пункту гледжання, апісаць той ці іншы канкрэтны від прафесійнай дзейнасці -- гэта значыць указаць, па-першае, патрэбнасці, матывы, мэты і ўмовы і, па-другое, дзеянні і аперацыі, а таксама іх узаемапераўтварэнні.

Пры апісанні ж той ці іншай прафесійнай задачы трэба канкрэтна абазначыць, што з'яўляецца мэтай і ў якіх умовах яе неабходна дасягнуць. Задача пры гэтым характарызуецца як некаторае адзінства мэты і ўмоў, у якіх яна дасягаецца пры розных акалічнасцях, з дапамогай розных аперацый. Кожны творчы чалавек павінен умець пры змяненні ўмоў знаходзіць новыя аперацыі для дадзенага дзеяння. Вырашэнне задачы заключаецца ў пошуку аптымальнага спосабу дасягнення пастаўленай мэты і выкананні дзеяння, якое вызначаецца ёю. Пошук жа спосабу вырашэння прадугледжвае арыентацыю ва ўмовах, іх

пазнанне і даследаванне ці акты мыслення. Пры гэтым мысленне можа быць накіравана на пошук спосабу вырашэння ці толькі дадзенай канкрэтнай задачы (у гэтым выпадку яно будзе эмпірычным), ці ўсіх задач дадзенага класа (тады яго трэба кваліфікаваць як тэарэтычнае). Гэта думка выказана В.В.Давыдавым, з якой мы цалкам згодны.

Зместам задачы павінна стаць апісанне канкрэтнай мэты ў разнастайных умовах. У гэтай сувязі прынцыповае значэнне набывае праблема спецыфікі вырашэння прафесійных задач. Цяжкасць заключаецца, на наш погляд, у тым, што псіхолаг павінен свабодна арыентавацца ў прафесійных задачах з той галіны, якую ён даследуе. Вось чаму для больш паспяховага вырашэння дадзенай праблемы неабходна цеснае супрацоўніцтва псіхолагаў і спецыялістаў-прафесіяналаў.

Магчыма вылучыць шэраг спецыфічных асаблівасцей тых задач, якія, на нашу думку, характэрны для кожнай прафесіі. Да іх ліку адносяцца складанасць умоў па сувязях і іх разнастайнасць па змесце, цяжкасць ахопу задач, зменлівасць і няпэўнасць умоў. Усе яны з'яўляюцца характэрнымі для шэрагу самых розных прафесій: рабочага, інжынера, педагога і іншых, датычаць ступені выяўленасці ці характару праяўленняў адзначаных асаблівасцей.

Пры даследаванні праблемы фарміравання прафесійнага мыслення важна, на наш погляд, абапірацца на тэарэтычнае палажэнне аб двух тыпах мыслення, якое распрацавана ў айчыннай псіхалогіі. Характарыстыка гэтых тыпаў дадзена вядомым псіхолагам В.В.Давыдавым.

Фарміраванне прафесійнага мыслення павінна ажыццяўляцца на аснове тэарэтычнага тыпу мыслення. Менавіта пры такіх умовах яно будзе адначасова творчым, дыялектычным. Такое мысленне дазволіць у сучасных умовах змястоўна палепшыць навучанне школьнікаў, студэнтаў, бо яно накіравана на станаўленне творчых здольнасцей чалавека. А творчы чалавек, як вядома, заўсёды здольны вырашаць новыя, арыгінальныя, нечаканыя, нестандартныя задачы.

Такім чынам, адзінства прафесійнага і рэфлексіўнага мыслення, на наш погляд, заключаецца ў тым, што яно з'яўляецца адначасова дыялектычным, творчым, дазваляе гранікнуць у сутнасць рэчаў і з'яў, выдзяляць галоўныя якасці і сувязі. Акрамя таго, прафесійнае мысленне мае сваю спецыфіку, якая праяўляецца у асаблівасцях прафесійных задач і прафесійнай дзейнасці ў цэлым. З улікамі адзначанага праблема фарміравання прафесійнага мыслення ў студэнтаў ВНУ павінна стаць адной з галоўных задач сучаснай вышэйшай адукацыі.

**Суддзева Н.Л.,**
*дацэнт*

## ЛІТАРАТУРА ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Намі праведзена апытанне студэнтаў спецыялізацыі сацыяльнай педагогікі, якія наведвалі спецсемінар па літаратуры. Яны адказвалі на пытанне: «Ці дае вам штонебудзь у плане прафесійнай падрыхтоўкі вывучэнне такога прадмета, як літаратура? Калі так, то што менавіта?»

Прыводзім найбольш характэрныя вытрымкі з іх адказаў.

— Заняткі па літаратуры... дазваляюць змадэліраваць і разгледзець з многіх пунктаў гледжання сацыяльныя сітуацыі, з якімі нам давядзецца сутыкнуцца ў выніку спецыфікі нашай будучай прафесіі. Акрамя таго, вывучэнне літаратурных твораў пашырае спектр асабовых перажыванняў, што садзейнічае лепшаму разуменню праблем патэнцыяльных кліентаў сацыяльных педагогаў (А.Краўчанка).

—Літаратура дае псіхалагічныя веды. Яна нешта накшталт хрэстаматыі да падручніка па псіхалогіі (С.Садоненка).

— Літаратура развівае гнуткасць мыслення ў адносінах да розных псіхалагічных сітуацый (Г.Лабай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ